нову, якая можа ўключаць, напрыклад, такую паслугу для сямейных турыстаў, як догляд за дзецьмі.

На нашу думку, калі ўлічваць нерэалізаваны патэнцыял сямейнага турызму ў аптымізацыі ўнутрысямейных адносін, сфера турызму патрабуе псіхолага-педагагічнага суправаджэння, якое могуць ажыццяўляць сацыяльныя педагогі. Аднак гэта праблема патрабуе самастойнага даследавання.


1. *Монастырский Д.В.* Взаимодействие учреждений культуры и кинопроката при организации досуга молодёжи: Автореф. дис. … канд. пед. наук. – М., 1999. – 21 с.

2. *Летавина Е.И.* Семейный туризм – одна из форм полноценного общения семьи в свободное время // Развитие самодеятельного туризма как фактора организации свободного времени населения: Тез. Всесоюзн. науч.-практ. конф. – М., 1988. – 257 с.

3. *Остапец А.А.* Педагогика туристско-краеведческой работы в школе. – М.: Педагогика, 1985. – 178 с.

4. *Квартальнов В.А.* Туризм, экскурсия, обмен: современная практика. – М.: Наука, 1993. – 203 с.


*В.У.Рагачова*

## ПРЫНЦЫПЫ АРГАНІЗАЦЫІ КАРЭКЦЫЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Карэнныя змены ў палітычным і эканамічным жыцці апошніх дзесяцігоддзяў выклікалі прынцыпова новае разуменне сутнасці культурна-адпачынкавай дзейнасці. Так, разам з агульнапрызнанымі функцыямі рэкрэацыі і развіцця [1] сёння важнай функцыяй гэтай дзейнасці з'яўляецца прафілактыка з'яў дэзадаптацыі, працы з дзецьмі, маючымі тыя або іншыя адхіленні ад нормы ў развіцці. Гэта, у сваю чаргу, патрабуе распрацоўкі прынцыпаў карэкцыйна-развіццёвай дзейнасці ва ўмовах арганізацыі і правядзення вольнага часу.

На наш погляд, адным з вядучых прынцыпаў арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карэкцыйна-педагагічнай дзейнасці ў сферы вольнага часу з'яўляецца прынцып гуманістычнай накіраванасці карэкцыйнай дзейнасці. Ён патрабуе гарманічнага спалучэння мэт грамадства і мэт асобы пры некаторай прыярытэтнасці апошніх, арыентацыі карэкцыйна-выхаваўчага працэсу на асобасныя магчымасці дзіцяці, яго інтарэсы і патрэбнасці. Рэалізуецца гэты прынцып у культурна-адпачынкавай дзейнасці праз апору на станоўчыя якасці дзіцяці, веру ў яго сілы, жаданне педагога дапамагчы яму пераадолець цяжкасці ў развіцці, каб найбольш поўна раскрыць свой унутраны патэнцыял. Толькі гуманныя, паважлівыя адносіны да кожнага дзіцяці дазваляюць эфектыўна будаваць карэкцыйна-педагагічны працэс.

Прынцып мэтанакіраванасці карэкцыйна-педагагічнага працэсу. Пры арганізацыі карэкцыйна-развіццёвай дзейнасці дзяцей у сферы вольнага часу неабходна выходзіць з агульных мэт выхавання і развіцця асобы дзіцяці, якія накіраваны на стварэнне неабходных умоў для яго сацыялізацыі і развіцця. У той жа час рэалізацыя карэкцыйнай праграмы, этапаў яе ўкаранення ў працу гурткоў і секцый, дасягненне шляхоў і спосабаў патрэбнага выніку павінны быць асобасна арыентаваныя. Толькі ў гэтым выпадку могуць быць забяспечаны аптымальныя ўмовы для гармоніі ў развіцці дзіцяці.

Прынцып цэласнасці і сістэмнасці карэкцыйна-педагагічнага працэсу рэалізуецца тады, калі педагагічны працэс разглядаецца як сістэма, г. зн. як сукупнасць элементаў, што ствараюць пэўнае адзінства. У гэтым выпадку карэкцыйна-педагагічная дзейнасць у сферы вольнага часу бу- дзе з'яўляцца элементам педагагічнай сістэмы. Такім чынам, карэкцыйная сістэма будуецца ў агульным рэчышчы педагагічнага працэсу, але пры гэтым мае свае мэты, змест, метады і сродкі.

Прынцып полідзейнасці асобы ў карэкцыйнай культурна-адпачынкавай праграме. Базавую аснову гэтага прынцыпу складае прынятае ў айчыннай псіхолага-педагагічнай навуцы палажэнне аб прадметна-дзейнаснай аснове змянення псіхікі незалежна ад віду дзейнасці (гульня, вучоба і інш.). Жыццядзейнасць чалавека рэалізуецца як складаная сістэма сацыяльных роляў, выконваемых у кожным з відаў дзейнасці. Сутнасць карэкцыйна-педагагічнай працы праяўляецца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым, што яна, не парушаючы адносін дзіцяці са светам, людзьмі, не ізалюючы яго ад прывычных формаў актыўнасці, стварае аптымальную мадэль культурна-адпачынкавай дзейнасці, у якой прысутнічаюць розныя яе віды [2]. Свабода іх выбару дае дзіцяці шырокую прастору для самавыяўлення і павышэння самаацэнкі.

Прынцып уліку індывідуальных і ўзроставых асаблівасцей дзіцяці. Маючы багаты арсенал прыёмаў і сродкаў уздзеяння на асобу дзіцяці, культурна-адпачынкавая дзейнасць дазваляе намеціць у межах узроставай “нормы” праграму развіцця для кожнага дзіцяці з улікам індывідуальнасці, тым самым даючы кожнаму дзіцяці права на выбар самастойнага шляху развіцця. Карэкцыйнае ўздзеянне на асобу ў сферы вольнага часу ажыццяўляецца праз аптымізацыю ўмоў яе развіцця, таму што дзіцяці даецца магчымасць шырокай арыентацыі ў розных праблемных сітуацыях праз удзел у мностве мерапрыемстваў. Дзякуючы гэтаму яна апрабоўвае вялікі спектр роляў, набывае эмацыянальны вопыт рэагавання на тыя ці іншыя праблемы ў супрацоўніцтве з дарослымі.

Сёння вялікай папулярнасцю карыстаецца тэзіс аб акселерацыі дзіцячага развіцця. У сувязі з гэтым у практыцы грамадскага выхавання і ў імкненнях значнай часткі сучасных бацькоў назіраецца тэндэнцыя паскарэння пераходу дзяцей з адной узроставай ступені на наступную. А дасягаецца гэта праз выцясненне з жыцця дзіцяці тыпова дзіцячых відаў дзейнасці – гульні, малявання, канструявання, замены іх “больш дарослымі”, пераважна вучэбнымі відамі дзейнасці. На гэтым фоне асаблівую значнасць атрымлівае думка аб значэнні кожнага ўзроставага перыяду дзяцінства для агульнага ходу фарміравання асобы, выказаная А.В.Запарожцам: “Узніклыя на ранніх узроставых ступенях псіхалагічныя новаўтварэнні маюць абсалютнае значэнне для ўсеагульнага развіцця індывіда, уносяць свой асобы, непаўторны ўклад у фарміраванне чалавечай асобы” [2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, пры арганізацыі карэкцыйна-педагагічных праграм у сферы вольнага часу неабходна ўлічваць індывідуальныя асаблівасці кожнага дзіцяці і зыходзіць з разумення унікальнай ролі, якую адыгрывае менавіта кожны перыяд у яго развіцці. Шырокае выкарыстанне выхаваўчых магчымасцей, характэрнае менавіта для культурна-адпачынкавай дзейнасці дзяцей, дзе няма жорсткай рэгламентацыі формаў, зместу дзейнасці пэўнай узроставай групы, з'яўляецца адным са сродкаў прафілактыкі адхіленняў у развіцці, ненасільнай карэкцыі псіхічных станаў і культуры паводзін дзіцяці.

Прынцып сістэмнасці карэкцыйных, прафілактычных і развіваючых задач пры арганізацыі вольнага часу дзяцей. Агульнавядома, што ўсе аспекты развіцця асобы ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены.

Змястоўны аспект культурна-адпачынкавай дзейнасці вельмі шырокі, і гэта дае магчымасць эфектыўна ўплываць на працэс развіцця дзіцяці. Культурна-адпачынкавая дзейнасць дазваляе аптымізаваць развіццё праз інтэнсіфікацыю "моцных" бакоў асобы дзіцяці. Акрамя таго, культурна-адпачынкавая дзейнасць накіравана не проста на карэкцыю адхіленняў у развіцці, але і на стварэнне умоў для найбольш поўнай рэалізацыі патэнцыяльных магчымасцей гарманічнага развіцця асобы дзіцяці.

Такім чынам, карэкцыйна-педагагічная праграма, якая выкарыстоўваецца ў культурна-адпачынкавай дзейнасці, мае мэту, рэалізуемую ў сістэме задач трох узроўняў: карэкцыйнага (выпраўленне парушэнняў развіцця); прафілактычнага з улікам трох ступеняў (папярэджванне цяжкасцей у развіцці) і развіваючага (аптымізацыя, стымуляванне і ўзбагачэнне зместу развіцця). Рэалізацыя гэтай сістэмы можа забяспечыць поспех і эфектыўнасць карэкцыйнага ўздзеяння на развіццё дзіцяці ў культурна-адпачынкавай дзейнасці.

Адзначаныя прынцыпы, на наш погляд, ствараюць зыходную базу для арганізацыі эфектыўнай карэкцыйнай работы сацыяльнага педагога ў сферы вольнага часу. Іх інтэгратыўнае выкарыстанне дазваляе забяспечыць цэласны працэс развіцця асобы дзіцяці, вызначыць логіку сістэмы карэкцыйных заняткаў, намеціць агульную стратэгію на адпа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведных ступенях кіравання працэсам педагагічнай карэкцыі развіцця дзяцей.

1. *Ариарский М.А.* Прикладная культуралогия. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб.: Издательство “ЭГО”, 2001.

2. *Запорожец А.В.* Избранные психологические труды: В 2 т. / Под ред. В.В.Давыдова, В.П.Зинченко. – М.: Педагогика, 1986. – Т. 1. – С. 54.

3. *Киселева Т.Г., Красильников Ю.Д.* Основы социально-культурной деятельности: Учеб. пособие. – М.: Моск. гос. ун-т культуры, 1995.

*С.У.Раманава*

## ЗНАЧЭННІ ЯК СПЕЦЫФІЧНЫ КУЛЬТУРНЫ СРОДАК СУВЯЗІ ЧАЛАВЕКА З СУСВЕТАМ І ГРАМАДСТВАМ

Значэнні – гэта спецыфічны культурны сродак сувязі чалавека з навакольным светам ці суб’екта з аб’ектам пры дапамозе знакаў. Да знакавых сістэм належаць натуральныя і штучныя моўныя сістэмы, розныя сістэмы сігналізацыі, мовы выяўленчых сістэм (вобразы, сімволіка). Уласцівасці знакавых сістэм вывучае семіялогія.

Сінонімам да тэрміна “значэнні” выступае тэрмін “сэнсы”. Але гэтыя тэрміны не цалкам сінанімічныя. Калі сэнс абазначае адносіны знака да свайго прадмета, яго сэнсавы змест, то значэнне раскрывае суадносіны культурных кампанентаў (нормаў, каштоўнасцей, ведаў) з іншымі сродкамі сацыяльнай рэгуляцыі.

Для культуралогіі важна раскрыць суадносіны сэнсавага зместу розных знакавых сістэм з сацыяльнымі працэсамі і спецыфікай культурнага асяроддзя.

Самі знакі не змяшчаюць інфармацыі, яны патрабуюць расшыфроўкі, гэта значыць давядзення да свядомасці чалавека, іх разумення. Чым абумоўлена неабходнасць для чалавека выпрацоўваць значэнні, абазначаць рэчы, уласныя ўчынкі і перажыванні?

Рэчы, дзеянні людзей, псіхалагічныя працэсы самі па сабе культуры не складаюць. Гэта толькі будаўнічы матэрыял для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ